УДК 821.161.3-193*Л. Сільнова

# ВЕРШАВАНАЯ МІНІЯЦЮРА Ў ПАЭЗІІ Л. СІЛЬНОВАЙ

**Кірушкіна Марыя Іванаўна**
аспірант кафедры беларускай літаратуры ўстановы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны";
магістр філалагічных навук
(г. Гомель, Беларусь)

*Ключавыя словы: вершаваная мініяцюра, паэтычны эксперымент, "камунікатыўная рэальнасць", маргінальны жанр, асацыяцыі рэцыпіента.*

*У дадзеным артыкуле разглядаецца адметнасць рэалізацыі вершаванай мініяцюры ў паэзіі Л. Сільновай. Лірычныя тэксты маюць не толькі своеасаблівую прадметную тэматыку, але і характарызуюцца адметнымі мастацкімі асаблівасцямі паэтычнай формы. Устойлівыя суадносіны зместу, інтуіцыі аўтара, рэфлексіі чытача складаюць жанравую структуру паэтычных твораў.*

У сучаснай беларускай паэзіі папулярнай жанравай формай з'яўляецца вершаваная мініяцюра. Паэтычныя тэксты характарызуюцца найбольшай ступенню рэалізацыі суб'ектыўнага пачатку і спробай адлюстравання паэтычнага эксперыменту. Неабходна ўлічваць мастацкі стыль лірычных твораў, які складаюць розныя кампаненты: аўтарская ідэя, вобразная эстэтыка і эмацыянальная рэакцыя чытача.

Мастацкае мадэляванне мініяцюрных тэкстаў прадстаўлена ў вершатворчасці Л. Сільновай. Нізка паэтычных твораў "Сняжынкі" (мініяцюры)



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

спакваля арыентуе чытача на зразумелы змест. Мініяцюры паэткі – гэта лірычныя рыфмаваныя 4-радковыя або 5-радковыя лірычныя творы, зместавыя кампаненты якіх камунікатыўна звязаны з адчуваннямі рэцыпіента. Напрыклад, у мініяцюры "Перлінка", дзе падсвядома ствараецца зусім іншы кантэкст, аўтар "паведамляе" пра падзеі, якія носяць ўнутраны (суб'ектыўны) характар:

Лягу-стаюся,
Перлінкай закачуся
У шчылінку прасторавую:
Буду чакаць званка тэлефоннага… [2, с. 179].

Такім чынам, у тэксце нараджаецца іншая "рэальнасць", не залежная ад суб'ектыўна-эстэтычных і візуальных здагадак чытача.

Лірычныя творы Л. Сільновай нясуць у сабе пэўную камунікатыўную падзею, у аснове якой – асабістае "выказванне" аўтара. В. Цюпа лічыць, што "жанры трэба разумець як сутнасныя катэгорыі "субстанцыянальнай" прыроды розных сфер дыскурсіўнай практыкі з іх "унутранымі заканамернасцямі", то бок у іх самаідэнтычнасці" [4]. Таму можна меркаваць, што дадзеныя міні-творы паэткі маюць дачыненне да дыскурсу (або дыскурсіўных практык у літаратуры), паколькі важнай вартасцю іх лірычнага зместу з'яўляецца не значэнне, а сэнс – "камунікатыўная рэальнасць" [4].

Адметнасцю паэтычных мініяцюр Л. Сільновай з'яўляецца выкарыстанне аўтарам варыянтаў асабістага імя – Людка, Людміла. Такім чынам у тэкстах ствараецца "камунікатыўная сувязь" паміж аўтарам і рэцыпіентам. "Інфармацыйная структура" міні-твораў нагадвае натуральнае маналагічнае выказванне. Пытаннямі насычана наступная мініяцюра:

Людка, Людка…
Бога любка:
У яго на плячы галубка.

Белая? шызая? чорная?
Усе роўныя! [2, с. 178].

Нескладаныя аўтарскія пытанні выклікаюць мноства асацыяцый. Ідэя лірычнага твора, напэўна, звязана з вобразам-сімвалам галубкі – мірам, чысцінёй і каханнем.

Паэтка праўдзіва ўвасабляе і вядомыя жыццёвыя ісціны:

Кожны хоча, каб яго любілі,
Лашчылі і чысцілі падкрыллі…

Кожны хоча… А ці кожны можа?
Ціха, ціха ты, не так варожа [2, с. 178].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сэнс міні-верша фарміруецца на спалучэнні жадання чалавека быць любімым і лёсавызначальнай акалічнасці гэту асалоду мець. Адкрытая прастора тэксту для разваг чытача дазваляе правільна вырашыць пытанне-аксіёму: а ці кожны можа? Л. Сільнова не толькі закранае актуальныя праблемы грамадства, але і стварае мініяцюры, змест якіх выяўляецца пасродкам фонасемантычных супадзенняў:

Жыбуль – любы ж –
Жылам малы ж.

Яхант? Няхай!
Шык – я, я – кыш! [2, с. 177].

Сэнс паэтычнага выказвання ўтвараецца за кошт "гульні гукаў". Адметнасць мініяцюры – мілагучнасць, што ствараецца праз алітэрацыю шыпячых ([ж], [ш]) і асананс галосных гукаў ([ы], [а]). У мастацка-эстэтычных адносінах арыгінальны спосаб перадачы зместу мае шэраг інтэрпрэтацый, дзе кропкай адліку з'яўляецца прозвішча вядомага паэта-авангардыста – Віктара Жыбуля.

Такім чынам, мініяцюры Л. Сільновай – гэта лірычныя творы, набліжаныя па змесце і структуры да акта выказвання з адсутнасцю вобразна-выяўленчых сродкаў і адкрытай прасторай тэксту для пошуку адказаў на пытанні, якія спалучаны з жыццёвай філасофіяй аўтара.

У сучаснай беларускай паэзіі папулярнымі з'яўляюцца маргінальныя лірычныя жанры. У слоўніку І. Ільіна [1] панядце маргінальнасці мае наступнае значэнне: перыферыйнасць якой-небудзь з'явы сацыяльнай жыццядзейнасці чалавека ў адносінах да дамінуючай тэндэнцыі свайго часу або агульнапрынятай філасофскай, этычнай традыцыі. У адносінах да жанравых асаблівасцей літаратурнага тэксту гэта паэтычныя формы, якія ўзнікаюць на мяжы розных эстэтычных сістэм і займаюць перыферыйную пазіцыю адносна традыцыйных жанраў.

Маргінальным жанрам з'яўляюцца паэтычныя мініяцюры "рысасловы" Л. Сільновай з аднайменнага зборніка [3]. "Тэксты" паэткі ўяўляюць сабой сінтэтычныя аднаслоўныя "кампаненты" выяўлення мастацкай думкі. У "рысасловах" злучаюцца паэзія і мастацкае мастацтва (графіка): у паэтычным слове для выражэння пэўнага сэнсу некаторыя з літар замяняюцца графічным малюнкам. Ключом для "расшыфроўкі" значэння таго ці іншага "тэксту" служаць асацыяцыі чытача. Напрыклад, у "рысаслове" "Космас" [3, с. 14] для стварэння мастацкага вобраза тэксту замест літары "О" паэткай прадстаўлены сімвалічны малюнак у выглядзе каметы з зоркамі. Эстэтычна-ідэйны змест паэтычнага тэксту "Ёлка" [3, с. 10] мае нескладаны паэтычна-графічны код: аўтар замяняе літару "Л" малюнкам навагодняй упрыгожанай яліны, а апошняя літара "А" па штрыхах нагадвае чалавека.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Візуальная паэзія Л. Сільновай, якая ўключае аднаслоўныя паэтычныя тэксты, – гэта свайго роду эксперыментальныя жанравыя формы, у якіх галоўная роля адносна сэнсавай нагрузкі мастацкага твора адводзіцца сімволіцы і асацыятыўнаму значэнню літар.

Такім чынам, на жанравую спецыфіку паэтычных твораў паэткі ўплываюць эстэтычна-творчы досвед аўтара, "літаратурная рэфлексія" чытача і адпаведны змест.

**Літаратура**


1. Ильин, И. Постмодернизм : словарь терминов / И. Ильин. – Мінск : ИНИОН РАН – INTRADA, 2001. – 384 с.
2. Сільнова, Л. Горад Мілаград / Л. Сільнова. – Мінск : Кнігазбор, 2016 – 187 с.
3. Сільнова, Л. Рысасловы / Л. Сільнова. – Полацк : Полац. ляда, 1994. – 35 с.
4. Тюпа, В. Жанр и дискурс / В. Тюпа // Критика и семиотика. – 2011. – 165. – С. 31–42.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова